# Вышэй узровень работы мясцовых Саветаў БССР

**В. І. КАЗЛОЎ**

Народы вялікага Савецкага Саюза пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і вялікага Сталіна, паспяхова выканаўшы першы пасляваенны пяцігадовы план аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі нашай краіны, ажыццяўляюць у 1951 годзе грандыёзны план далейшых работ па будаўніцтву комунізма ў СССР.

У адзінай сям'і савецкіх народаў працоўныя Савецкай Беларусі за пасляваенныя гады, у выніку вялікай палітычнай і арганізатарскай работы, праведзенай на месцах партыйнымі і савецкімі органамі, дабіліся значных поспехаў ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Дзякуючы нястомнай увазе і пастаянным клопатам партыі большэвікоў, Савецкага ўрада і асабіста таварыша Сталіна аб беларускім народзе Беларуская Савецкая Соцыялістычная Рэспубліка паспяхова выканала пасляваенны пяцігадовы план аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі.

Прамысловасць рэспублікі, амаль цалкам разбураная за час вайны, не толькі адноўлена, але і значна расшырана на аснове новай і больш сучаснай тэхнікі. Умацавалася энергетычная база БССР. Магутнасці электрастанцый рэспублікі ў 1950 годзе ў 1,8 раза перавысілі электрычныя магутнасці 1940 года. Магутнасць Мінскага энергавузла ў 1951 годзе пераўзыйдзе даваенны ўзровень амаль у 8 разоў і будзе роўна ўсім электрычным магутнасцям рэспублікі 1940 года. Значна палепшылася паліўная база. Асноўным палівам рэспублікі стаў торф. У параўнанні з 1940 годам узрасла вытворчасць будаўнічых матэрыялаў. Найбольш буйным дасягненнем у пасляваенным развіцці Беларусі з'яўляецца стварэнне ў рэспубліцы раду новых галін буйнай прамысловасці: аўтамабілебудаванне, трактарабудаванне, лакамабілебудаванне і інш. Пры агульным павелічэнні аб'ёму вытворчасці на 16 процантаў супроць 1940 года металаапрацоўка ў рэспубліцы ўзрасла ў 2 — 3 разы, а машынабудаванне ў 3,2 раза. Стварэнне ў рэспубліцы буйнай машынабудаўнічай прамысловасці мае вялікае значэнне для далейшага развіцця ўсіх галін народнай гаспадаркі Савецкай Беларусі.

За гады пасляваеннай пяцігодкі адноўлена і атрымала далейшае развіццё сельская гаспадарка рэспублікі. Грамадская гаспадарка калгасаў, разбураная ў гады нямецка-фашысцкай акупацыі, па раду важнейшых галін перавысіла ўзровень 1940 года. Пасеўная плошча за пяцігоддзе павялічылася на 28 процантаў. Ураджайнасць і валавы збор збожжа цяпер значна вышэй, чым быў да вайны. Павялічылася і пагалоўе грамадскай жывёлы ў калгасах.

У бягучым годзе дзяржаўны план хлебанарыхтовак рэспублікай выканан датэрмінова, на 40 дзён раней, чым у мінулым годзе, зернем высокай якасці.

У пасляваенныя гады ўзрасла тэхнічная ўзброенасць сельскай гаспадаркі. Магутнасць трактарнага парка машынна-трактарных станцый рэспублікі павялічылася ў параўнанні з 1940 годам на 37 процантаў,

а аб'ём сельскагаспадарчых работ, выкананы трактарамі МТС у калгасах, павялічыўся на 73 проценты. У бягучым годзе машынна-трактарнымі станцыямі рэспублікі выканана ў калгасах трактарных работ у пераводзе на мяккае ворыва на 1 мільён 200 тысяч гектараў больш, чым у 1950 годзе, прычым убрана зерневых камбайнамі ў тры разы больш, а лёну ўбрана ільнакамбайнамі і ільнацерабілкамі ў 4 разы больш, чым у мінулым годзе. У рэспубліцы стала значна больш машынна-трактарных майстэрань і рамонтных заводаў.

Умела прымяняючы багатую совецкую тэхніку, выкарыстоўваючы дасягненні совецкай агранамічнай навукі і вопыт майстроў высокіх ураджаяў, сістэматычна паляпшаючы арганізацыю працы, перадавыя калгасы Беларусі дабіліся значнага росту ўраджайнасці зерневых і тэхнічных культур. Лепшыя перадавікі сельскай гаспадаркі рэспублікі за атрыманне высокіх ураджаяў зерневых і тэхнічных культур удастоены высокага звання Героя Социялістычнай Працы, узнагароджаны ордэнамі і медалямі Совецкага Саюза. Зараз у рэспубліцы створаны ўсе прадпасылкі для далейшых больш высокіх тэмпаў развіцця ўсіх галін сельскагаспадарчай вытворчасці, уздыму эканомікі калгасаў і росту матэрыяльнага добрабыту калгаснікаў.

Поспехі, дасягнутыя ў развіцці социялістычнай сельскай гаспадаркі Беларусі, з'яўляюцца вынікам стварэння буйнай социялістычнай індустрыі і калгаснага ладу ў нашай краіне. Гэтыя поспехі з'яўляюцца вынікам паслядоўнага правядзення ў жыццё палітыкі большэвіцкай партыі ў калгасным будаўніцтве. Няўхільнае правядзенне лініі партыі у калгасным будаўніцтве з'яўляецца важнейшай умовай развіцця социялістычнай сельскай гаспадаркі.

Ва ўсёй рабоце па далейшаму ўздыму сельскай гаспадаркі вялікая роля належыць мясцовым Советам, як органам дзяржаўнай улады на мясцах, якім у нашай краіне прадастаўлены шырокія правы і поўная самастойнасць у вырашэнні пытанняў мясцовага значэння, а таксама ў правядзенні агульнадзяржаўных мерапрыемстваў і ўсёй палітыкі большэвіцкай партыі і Совецкага ўрада. Дзейнасць Советаў будуецца на аснове дэмакратычнага цэнтралізма. Гэта значыць, што ў сваёй рабоце мясцовыя Советы павінны строга захоўваць законы, пастановы, распараджэнні і ўказанні ўсіх вышэйстаячых органаў, безумоўна падпарадкоўвацца ўсім дырэктывам цэнтра, кіравацца адзіным дзяржаўным народна-гаспадарчым планам і побач з гэтым усямерна праяўляць ініцыятыву знізу, улічваць усе мясцовыя асаблівасці і патрэбы, развіваць мясцовую гаспадарку, разгортваць і заахвочваць самадзейнасць і актыўнасць шырокіх народных мас.

У рабоце мясцовых Советаў нашай рэспублікі накоплен немалы вопыт. Гэты вопыт паказвае, якую велізарную ролю адыгрываюць мясцовыя Советы ў калгасным будаўніцтве. Разам з тым у рабоце многіх мясцовых Советаў ёсць яшчэ рад сур'ёзных памылак і недахопаў. Яны заключаюцца перш за ўсё ў тым, што Советы не сканцэнтравалі сваёй увагі на арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў, на ўсямерным развіцці калгаснай вытворчасці і памнажэнні грамадскіх багаццяў калгасаў.

Вядома, што ўзбуйненне дробных калгасаў праводзілася з мэтаю стварыць найбольш спрыяльныя ўмовы для паспяховага вырашэння галоўнай задачы ў галіне сельскай гаспадаркі. Такой галоўнай задачай з'яўляецца значнае павышэнне ўраджайнасці ўсіх сельскагаспадарчых культур, хуткае павелічэнне грамадскага пагалоўя жывёлы пры адначасовым значным росце яго прадуктыўнасці.

Шматгадовы вопыт калгаснага будаўніцтва паказаў, што найбольш паспяхова развіваюць грамадскую гаспадарку буйныя калгасы, якія маюць значныя перавагі перад дробнымі, і ўзбуйненне калгасаў стварае яшчэ больш спрыяльныя ўмовы для далейшага росту, раскрывае перад калгасным сялянствам велізарныя перспектывы і ўжо дало першыя станоўчыя вынікі. Многія ўзбуйненыя калгасы вырасцілі ў гэтым годзе больш высокі ўраджай, далі магчымасць датэрмінова выканаць дзяржаўныя планы, атрымаць на працадні больш хлеба і іншых прадуктаў. Цяпер паміж калгасамі больш правільна размеркаваны зямельныя масівы, лугі, выпасы, створаны ўмовы для лепшага і больш прадукцыйнага выкарыстання сельскагаспадарчых машын, прадстаўляецца магчымасць лепш сканцэнтраваць матэрыяльныя сродкі і рабочую сілу як у вытворчым, так і ў культурна-бытавым будаўніцтве.

Узбуйненне калгасаў паставіла перад мясцовымі Советамі, і ў прыватнасці, перад сельсоветамі рад новых задач, з вырашэннем якіх неабходна ў бліжэйшы час з чэсцю справіцца.

У прынятай 14 чэрвеня 1951 г. пастанове ЦК КП(б) Беларусі «Аб мерах па палепшанню работы сельскіх Советаў дэпутатаў працоўных Беларускай ССР» адзначана, што работа многіх сельскіх Советаў яшчэ не адпавядае ўзросшым патрабаванням, звязаным з узбуйненнем калгасаў і завяршэннем у асноўным калектывізацыі ў заходніх абласцях рэспублікі. Многія сельскія Советы не ўлічваюць таго, што стварэнне буйных калгасаў павялічвае іх адказнасць за вядзенне грамадскай гаспадаркі калгасаў. Праверка работы раду сельскіх Советаў паказала, што яны яшчэ слаба дапамагаюць узбуйненым калгасам развіваць шматгалінную грамадскую гаспадарку, недастаткова клапоцяцца аб высокапрадукцыйным выкарыстанні машыннай тэхнікі МТС і сродкаў вытворчасці саміх калгасаў для павышэння культуры земляробства і жывёлагадоўлі, мала ўвагі ўдзяляюць памнажэнню грамадскага багацця калгасаў і павышэнню дабрабыту калгаснікаў.

Узбуйнены калгас — складаная сельскагаспадарчая вытворчасць. Кіраваць ім не лёгка. Сельскія Советы павінны ўсямерна дапамагаць праўленням і старшыням калгасаў уваходзіць ва ўсе дэталі калгаснай вытворчасці, мабілізаваць шырокія масы калгаснікаў на барацьбу за хуткае і ўсебаковае развіццё грамадскай гаспадаркі калгасаў. Яны павінны таксама аказваць дзейсную дапамогу калгасам у хуткім правядзенні землеўпарадкавання, увядзенні і асваенні правільных травапольных севазваротаў, будаўніцтве грамадскіх пабудоў, наладжванні ўліку працы, устанаўленні правільных норм выпрацоўкі і расцэнак аплаты працы.

Баявая задача сельскіх Советаў заключаецца ў тым, каб разам з праўленнямі калгасаў пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый усямерна ўмацоўваць вытворчыя брыгады ў калгасах, як асноўную і галоўную форму арганізацыі калгаснай вытворчасці.

Калгас з'яўляецца найбольш важнай і складанай гаспадаркай на тэрыторыі сельскага Совета. З прычыны гэтага сельскія Советы абавязаны пастаянна клапаціцца аб працвітанні калгасаў, кіраваць імі, арганізоўваць і праводзіць у жыццё мерапрыемствы комуністычнай партыі і Совецкага ўрада па калгаснаму будаўніцтву.

Вялікія задачы стаяць перад мясцовымі Советамі заходніх абласцей рэспублікі. Апіраючыся на актыўнасць калгасных мас, мясцовыя Советы павінны ў найкарацейшы тэрмін, на аснове ўзмацнення палітычнай работы, поўнасцю завяршыць калектывізацыю ў заходніх абласцях. Гэта дасць магчымасць накіраваць усе сілы партыйных і совецкіх органаў

заходніх абласцей БССР на палітычнае і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў.

Мясцовыя Советы пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый павінны ўзмацніць сваю работу і па знішчэнню сур'ёзных недахопаў, якія ёсць у калгасах заходніх абласцей па абагульненню асноўных сродкаў вытворчасці, арганізацыі грамадскай працы, выхаванню кіруючых калгасных кадраў, развіццю грамадскай жывёлагадоўлі, вядучы рашучую барацьбу з нарушальнікамі Статута сельскагаспадарчай арцелі. Пры правядзенні ўсіх гэтых мерапрыемстваў трэба ўлічваць, што ў рабоце мясцовых Советаў заходніх абласцей ёсць свае асаблівасці. Яны выцякаюць з таго, што ў гэтых абласцях калгасы ў сваёй пераважаючай большасці маладыя, у іх толькі пачынаецца работа па выхаванню учарашніх аднаасобнікаў у духу адданасці калгаснаму ладу, сацыялістычных адносін да працы, да грамадскай уласнасці. Мясцовыя Советы павінны настойліва і паслядоўна ажыццяўляць мерапрыемствы па ўмацаванню калгасаў, быць нецярпімымі да недахопаў, узначальваць ініцыятыву калгаснікаў, праяўляць большэвіцкую пільнасць і бязлітасна прасякаць варожую дзейнасць антыкалгасных і кулацкіх элементаў, якія прабуюць перашкодзіць калгаснаму будаўніцтву. Мясцовыя Советы пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый абавязаны штодзённа ажыццяўляць кіраўніцтва калгасамі і аказваць ім неабходную дапамогу ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў, у памнажэнні іх грамадскага багацця.

Вялікая адказнасць за ажыццяўленне мерапрыемстваў партыі і ўрада па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў ускладаецца на старшынь сельскіх Советаў. Старшыня сельскага Совета, як кіраўнік мясцовага органа ўлады, нясе адказнасць за тое, як праўленне і старшыня калгаса ажыццяўляюць рашэнні нашай партыі і Совецкага ўрада. Выдатны саратнік Леніна і Сталіна М. І. Калінін вызначыў ролю старшыні сельскага Совета як палітычнага кіраўніка. «Калі старшыня праўлення калгаса, — указваў М. І. Калінін, — ведае ўсім гаспадарчым жыццём калгаса і яго дасягненні вымяраюцца поспехамі ў галіне гаспадаркі, то старшыня сельскага Совета — асоба выбарная, надзеленая ўладаю, ад яго патрабуюцца не толькі спецыфічныя веды канцылярскай работы (што, зразумела, нядрэнна), а агульнапалітычны і культурны кругагляд, уменне арыентавацца як у пытаннях мясцовага жыцця, так і ў выкананні дзяржаўных абавязкаў, якія ляжаць на ім. Ад старшыні сельскага Совета патрабуецца правядзенне ў жыццё совецкіх прынцыпаў на практыцы, партыйны, большэвіцкі падыход да справы, што ні ў якім выпадку не падразумявае, каб старшыня сельсовета быў абавязкова партыйным, бо добрая работа сельскага Совета, кім-бы яна не праводзілася, з'яўляецца разам з тым па сутнасці партыйнай».

Старшыні сельскіх Советаў — гэта партыйныя і непартыйныя большэвікі, якія ажыццяўляюць дзяржаўнае кіраўніцтва калгасным будаўніцтвам, не падмяняючы старшынь праўленняў калгасаў, як гаспадарчых кіраўнікоў сельскагаспадарчай арцелі.

Велізарная і адказная роля старшыні сельскага Совета па кіраўніцтву калгасамі. Ён абавязан уваходзіць ва ўсе галіны калгаснай вытворчасці, добра разбірацца ў пытаннях фінансаў, гандлю, нарыхтовак; займацца ўсімі бакамі культурнага жыцця сяла. Практыка заўсёды ставіць перад старшынямі сельскіх Советаў усё новыя пытанні, для правільнага вырашэння якіх патрабуюцца немалыя веды. Старшыня сельскага Совета не можа абмяжоўваць свой кругагляд рамкамі сяла, бо ён як дзяржаўны дзеяч жыве інтарэсамі ўсёй краіны і таму павінен кіраваць мясцовымі справамі з дзяржаўнага пункту гледжання.

Па-сапраўднаму кіраваць калгасамі — гэта значыць забяспечваць захаванне Сталінскага статута калгаснага жыцця, правільнае спалучэнне інтарэсаў калгаснікаў з іх грамадскімі інтарэсамі, а найстражэйшае захаванне Статута сельгасарцелі — абавязковая ўмова хутчэйшага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў.

Неадкладнай задачай партыйных і савецкіх органаў, усіх мясцовых Саветаў і калгасаў, сельскіх тэрытарыяльных і калгасных партыйных арганізацый з'яўляецца павышэнне культуры земляробства, барацьба за дасягненне высокіх ураджаяў усіх сельскагаспадарчых культур ва ўсіх раёнах і калгасах рэспублікі. Для выканання гэтай задачы павінны быць выкарыстаны ўсе рэзервы і магчымасці. Адной з важнейшых умоў павелічэння валавых збораў сельскагаспадарчай прадукцыі з'яўляецца далейшае расшырэнне пасеўных плошчаў, для чаго неабходна ўключыць у сельскагаспадарчую вытворчасць землі, якія знаходзяцца пад пералогамі і залежамі, асушаныя, але не асвоеныя яшчэ тарфянікі, а таксама землі дзяржфонда. Асаблівая ўвага павінна быць удзелена расшырэнню пасеўных плошчаў кармавых і гароднінных культур, лёну, кок-сагызу, цукровых буракоў.

Савецкія органы павінны ўдзяляць вялікую ўвагу пытанням павышэння ўраджайнасці яравых зерневых культур. Неабходна рашуча зжыць недаацэнку яравых зерневых культур, якая яшчэ існуе ў радзе месц. Нельга мірыцца з вельмі нізкімі ўраджаямі яравых культур. Усе агратэхнічныя мерапрыемствы, якія забяспечваюць атрыманне высокіх ўраджаяў яравых зерневых культур, павінны строга выконвацца кожным калгасам, памятаючы, што нізкія ўраджаі яравых зерневых і ў сувязі з гэтым недабор значнай колькасці хлеба ставяць у цяжкае становішча грамадскую гаспадарку многіх калгасаў, асабліва жывёлагадоўлю. Задача партыйных і савецкіх органаў і ўсіх калгасаў заключаецца ў тым, каб, расшыраючы пасеўныя плошчы і павышаючы ўраджайнасць, безумоўна забяспечыць рэзкі ўздым ураджайнасці ўсіх зерневых і ў асаблівасці яравых культур. Дзяржаўным планам прадугледжана значнае павышэнне заданняў па сяўбе і ўраджайнасці тэхнічных культур: лёну, кок-сагызу, канатніка і канапель. Наша задача — з года ў год расшыраць пасеўныя плошчы пад тэхнічныя культуры, сістэматычна павышаць ураджайнасць гэтых культур, у што-б там ні стала з чэсцю выканаць гэта адказнае заданне партыі і ўрада.

Вопыт перадавых калгасаў, брыгад, звенняў і калгаснікаў рэспублікі з ўсёй пераканальнасцю паказвае, што атрыманне высокіх ураджаяў ва ўмовах БССР можа быць дасягнута ў кароткі тэрмін. Для гэтага неабходна перш за ўсё павысіць культуру земляробства, строга і няўхільна ажыццяўляць патрабаванні агратэхнікі, укараняць у вытворчасць багаты вопыт калгаснікаў-наватараў і дасягненні перадавой савецкай агранамічнай навукі.

Важнейшай і рашаючай умовай павышэння ўраджайнасці з'яўляецца шырокае правядзенне агратэхнічных мерапрыемстваў і прымяненне мясцовых і мінеральных угнаенняў. Між тым многія мясцовыя Саветы, сельскагаспадарчыя органы, а таксама праўленні калгасаў да гэтай важнейшай справы адносяцца пагардліва, безгаспадарна, забываючы аб тым, што ўгнаенне глебы — гэта самы галоўны, самы рашаючы сродак уздыму ўраджайнасці.

Як вядома, пытанні накаплення мясцовых угнаенняў — гною і торфу — абмяркоўваліся на VI пленуме ЦК КП(б) Беларусі. Цэнтральны Камітэт КП(б)Б і Савет Міністраў БССР зацвердзілі на 1951 год план накаплення і ўнясення ў глебу гною і торфу не менш

35 мільёнаў тон. З мэтай пасняховага выканання гэтай пастановы ўсім калгасам было рэкамендавана стварыць спецыяльныя брыгады па накапленню і вывазцы ўгнаенняў на палі і весці гэтую работу круглы год. У бягучым годзе калгасамі ўнесена пад пасевы сельскагаспадарчых культур гною на 9 мільёнаў 200 тысяч вазоў і торфу на 1 мільён 700 тысяч тон больш, чым у 1950 годзе. Аднак да гэтага часу вывазка і накапленне ўгнаенняў праходзяць яшчэ вельмі марудна і не ў тым аб'ёме, які прадугледжан рашэннем VI пленума ЦК КП(б)Б. Задача мясцовых Советаў — арганізаваць справу ўгнаення зямель, мабілізаваць усіх калгаснікаў на барацьбу за ўсямернае накапленне і выкарыстанне мясцовых угнаенняў, памятаючы, што гэта мае рашаючае значэнне ва ўздыме ўраджайнасці калгасных палёў.

Адным з важнейшых рычагоў далейшага ўздыму сельскай гаспадаркі рэспублікі з'яўляецца асушэнне і сельскагаспадарчае асваенне багацейшых тарфяных глебаў. Калгасы БССР маюць усе магчымасці ў бліжэйшыя гады асушыць і асвоіць сотні тысяч гектараў тарфянікаў. Гэта дасць велізарны эфект, узмоцніць грамадскую гаспадарку калгасаў рэспублікі і павялічыць іх даходы. Саюзны ўрад і ЦК ВКП(б) аказваюць калгасам нашай рэспублікі ў гэтай справе велізарную дапамогу. Дастаткова сказаць, што ўжо ў бягучым годзе ў нас ствараюцца 10 машынна-меліяратыўных станцый, аснашчоных дасканалай тэхнікай для выканання асушальных работ. На працягу 1951 — 1953 гг. пры МТС будзе арганізавана 200 машынна-меліяратыўных атрадаў, аснашчоных магутнымі трактарамі, канавакапальнікамі, дрэнажнымі і карчавальнымі машынамі і іншымі прыладамі, неабходнымі для асушэння і асваення балотных зямель.

Задача заключаецца ў тым, каб выкарыстоўваючы магутную советскую тэхніку, мабілізаваць працоўную актыўнасць шырокіх мас калгаснікаў на барацьбу за хутчэйшае асушэнне балот з тым, каб у самы найкарацейшы тэрмін увесці ў строй такі магутны рэзерв уздыму сельскай гаспадаркі рэспублікі, як тарфянікі, велізарныя масівы якіх у нас не выкарыстоўваюцца. І тут арганізатарская дзейнасць мясцовых Советаў павінна праявіцца з усёй сілаю.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі